© ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА
ISSN 1819-3625 № 2 (2003)

# Дзве рэканструкцыі.

Drive your cart and your plow over the bones of the dead.
*W. Blake.*

*Паліталогій усяго дзве, і існуе, адпаведна, толькі дзве палітычныя мовы.*

**Першая**: палітычная археалогія. “Археалогія” складаецца з даследванняў палітычных ідэй і апісання палітычнай прасторы па яе рэштках. Будзе вялікай памылкай лічыць, як гэта часта робяць, археалогіяй вывучэнне Арыстоцеля і не адносіць да яе даследванне твораў Лумана ці Фукуямы з-за таго, што яны “сучасныя”. Немагчыма разглядаць Платона, Вэбера і Парсанса ў якасці “жывой традыцыі”, а палітычную сістэму Германіі другой паловы XX стагодзя ў якасці “жывога аб’екту”. Да такіх практыкаў ужо зараз нельга ставіцца сур’ёзна. Апісаныя вышэй даследванні, з’яўляюцца толькі *рэканструкцыямі* аб’екта па яго *рэштках*, што ўласна і называецца археалогіяй.

**Другая** паліталогія з’яўляецца мадэляваннем (інжынерыяй). У адрозненне ад “археалогіі”, яна прэтэндуе на манаполію ў рэканструкцыі не *мінулага* і *іншага,* а сучаснага і свайго. І тут канцэпт *рэканструкцыі* прымае значэнне трансфармацыі. Уласна рэ-*канструкцыі:* тэхналогій і практыкі “рэканструкцыі і развіцця” палітычнай сістэмы.

Першая паліталогія будуе межы ў мысленні, другая ў прасторы. І праблема беларускай палітычнай навукі палягае ў тым, што ланшафт яе мыслення практычна цалкам выключае ланшафт палітычнай рэальнасці. За пераход *мяжы* ад мыслення (археалогіі) да рэальнасці (інжэнерыі) і наадварот трэба занадта многа плаціць, каб дазволіць сабе рабіць гэта досыць часта.

*Андрэй Казакевіч.*